Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры

“Зацвярджаю”
Рэктар БДУ
прафесар В. І. Стражаў
5 верасня 2005 г.

# ПРАГРАМА АЗНАЯМЛЯЛЬНА-АДАПТАЦЫЙНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ 4 КУРСА ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

**Спецыяльнасці 1 – 21 05 01 “Беларуская філалогія”,
1 – 21 05 04 “Славянская філалогія”**

Мінск
2005

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

УДК 371.016: 811.161.3(075.8)
ББК 74.268.1 Бел.я 73
П

Рэкамендавана Вучоным саветам
філалагічнага факультэта
27 мая 2005 г., пратакол № 6

Аўтары-складальнікі:
**Л. А. Мурына**, **Ф. М. Літвінка**,
**Н. Б. Рашэтнікава**, **І. М. Саматыя**, **І. Э. Саўко**

П **Праграма** азнаямляльна-адаптацыйнай педагагічнай практыкі студэнтаў IV курса філалагічнага факультэта: Спецыяльнасці 1 – 21 05 01 «Беларуская філалогія», 1– 21 05 04 «Славянская філалогія» / Аўт.-скл.: Л. А. Мурына, Ф. М. Літвінка, Н. Б. Рашэтнікава, І. М. Саматыя, І. Э. Саўко. – Мн.: БДУ, 2005. – 13 с.

У праграме раскрываюцца мэты, задачы, змест азнаямляльна-адаптацыйнай педагагічнай практыкі, прапануюцца даведачныя матэрыялы для арганізацыі назіранняў па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе.

Прызначана студэнтам філалагічнага факультэта, якія навучаюцца па спецыяльнасцях "Беларуская мова і літаратура", "Славянская мова і літаратура".

УДК 371.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

016: 811.161.3(075.8)
ББК 74.268.1 Бел.я

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by



© БДУ, 2005
© Калектыў аўтараў, 2005

# ПРАГРАМА
# АЗНАЯМЛЯЛЬНА-АДАПТАЦЫЙНАЙ
# ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

Адным са спосабаў падрыхтоўкі студэнтаў да працы настаўніка, фарміравання прафесійных уменняў і навыкаў з'яўляецца педагагічная практыка, якая арганізуецца на базе сярэдніх навучальных устаноў (школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў) Рэспублікі Беларусь.

Першым этапам педагагічнай практыкі студэнтаў філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта з'яўляецца азнаямляльна-адаптацыйная практыка, якая праводзіцца на IV курсе на працягу чатырох тыдняў (першы семестр) паралельна з вучэбнымі заняткамі на факультэце.

Азнаямляльна-адаптацыйная педагагічная практыка арганізуецца пасля вывучэння студэнтамі курсаў педагогікі і псіхалогіі паралельна з вывучэннем курсаў методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры. Валоданне тэарэтычнымі ведамі аб заканамернасцях развіцця, навучання і выхавання дзяцей, аб прынцыпах, змесце, метадах, формах навучанння і выхавання дазволіць студэнтам IV курса асэнсавана і кваліфікавана ажыццяўляць назіранні за вучэбна-выхаваўчым працэсам у сярэдняй школе. Паралельнае наведванне лекцыйных і практычных заняткаў па методыцы выкладання мовы і літаратуры і ўрокаў у сярэдняй школе будзе садзейнічаць сувязі тэорыі з практыкай, асэнсаванню студэнтамі прынцыпаў, зместу і спосабаў арганізацыі прафесійнай дзейнасці настаўніка ў сучасных умовах, фарміраванню ўменняў назіраць і

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

аналізаваць некаторыя формы арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў сярэдняй школе.

Мэтанакіраванае назіранне, аналіз вучэбна-выхаваўчага працэсу, вывучэнне педагагічнага вопыту дапамагаюць больш глыбока разабрацца ў складаных пытаннях педагагічнай тэорыі, садзейнічаюць развіццю педагагічнай назіральнасці. Акрамя таго, авалоданне методыкай назірання як адным са спосабаў навуковага даследавання істотна і для фарміравання даследніцкага падыходу да педагагічных з'яў, удасканалення якасцей творчай асобы.

**Змест педагагічнай практыкі** ўключае:

1) знаёмства студэнтаў з канкрэтнымі ўмовамі арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў сярэдняй школе; з кабінетам беларускай мовы і літаратуры;

2) вывучэнне вучэбных праграм, падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў па прадмеце; знаёмства з каляндарным і каляндарна-тэматычным планаваннем;

3) назіранне за прафесійнай дзейнасцю настаўніка-славесніка і працай вучняў у працэсе наведвання ўрокаў беларускай мовы і літаратуры.

**Асноўная мэта** назірання – заўважыць і асэнсаваць станоўчы вопыт у працы настаўніка, каб потым прымяніць яго ў працэсе актыўнай педагагічнай практыкі на 5 курсе і ў далейшай прафесійнай дзейнасці.

У час азнаямляльнай практыкі групавы кіраўнік арганізуе наведванне студэнтамі ўрокаў настаўнікаў-славеснікаў з наступным абмеркаваннем урокаў, на якім настаўнікі расказваюць будучым калегам пра тое, якія існуюць патрабаванні да сучаснага ўрока, як быў падрыхтаваны ўрок, ажыццяўляюць аналіз сваёй сістэмы навучання і г. д. У абмеркаванні ўрока актыўны ўдзел прымаюць групавы кіраўнік і студэнты-практыканты. У час такіх абмеркаванняў студэнты асэнсоўваюць крытэрыі ацэнкі ўрокаў, намячаюць той ідэал урока, да якога павінен імкнуцца кожны настаўнік. Пры гэтым звяртаецца ўвага на:

– важнасць правільнага вызначэння мэтаў урока;

– выбар тыпу і структуры ўрока, метадаў і прыёмаў навучання ў залежнасці ад мэтаў урока, зместу праграмнага матэрыялу, асаблівасцей вучняў пэўнага класа і г. д.;

– разуменне навучання як двуадзінага працэсу, дыялагічнага ўзаемадзеяння настаўніка і вучняў;

– захаванне прынцыпаў навучання і выхавання на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

У час назіранняў студэнты ажыццяўляюць запісы па наступнай схеме:

1. Дата назірання, школа, клас, месца ўрока ў раскладзе вучэбнага дня; прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка; колькасць вучняў, якія прысутнічаюць на ўроку.

2. Тэма ўрока. Месца гэтага ўрока ў агульнай сістэме ўрокаў па тэме (высвятляецца папярэдне).

3. Мэты ўрока (высвятляюцца ў настаўніка перад пачаткам ўрока).

4. Падрыхтаванасць да ўрока (афармленне дошкі, стан працоўных месцаў вучняў, падрыхтаванасць школьнікаў да ўрока і г. д.), абсталяванне.

5. Пратакольны запіс урока з аналітычным каментарыем. Ажыццяўляецца па наступнай схеме:

| **Ход урока** | **Аналітычны каментарый** |
|---|---|
| | |

Абмеркаванне ўрока адбываецца непасрэдна пасля яго заканчэння.

Пратакольны запіс урока з аналітычным каментарыем і запісы, зробленыя ў час абмеркавання ўрока, выкарыстоўваюцца студэнтамі на практычных занятках па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры.

У якасці справаздачнай дакументацыі студэнты здаюць групавому кіраўніку 4 пратакольныя запісы ўрокаў (2 – па мове, 2 – па літаратуры) з аналітычным каментарыем і вынікамі абмеркавання ўрока.

Ацэньванне працы студэнтаў IV курса на азнамляльна-адаптацыйнай практыцы ажыццяўляецца па сістэме “залічана” – “не залічана”.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Дадатак 1

# ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ НАЗІРАННЯЎ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## 1. 1. ДЗЕЙНАСЦЬ НАСТАЎНІКА І ВУЧНЯЎ НА ЎРОКУ

Каменціруючы ўрок, пажадана аналізаваць дзейнасць на ўроку і настаўніка, і вучняў.

**Дзейнасць настаўніка на ўроку:**

**I. Арганізацыйная дзейнасць:**

– наяўнасць плана ўрока і ступень яго рэалізацыі;

– наяўнасць наглядных і тэхнічных сродкаў навучання, вучэбных дапаможнікаў і эфектыўнасць выкарыстання іх на ўроку;

– выкананне псіхалагічных і гігіенічных патрабаванняў да арганізацыі ўрока;

– наяўнасць зваротнай сувязі;

– веданне прадмета настаўнікам і ўзровень яго педагагічнага майстэрства;

– вядзенне дакументацыі (сшыткі, дзённікі, класны журнал);

– маўленне настаўніка (тэмп, дыкцыя, інтэнсіўнасць, вобразнасць, эмацыянальнасць, дакладнасць, выкарыстанне спецыяльнай тэрміналогіі);

– педагагічная культура, такт, знешні выгляд настаўніка;

– рацыянальнасць выкарыстання часу ўрока.

**II. Дыдактычная дзейнасць:**

– улік і ступень адлюстравання ў выкладчыцкай дзейнасці прынцыпаў навучання;

– ступень дасягнення галоўнай дыдактычнай мэты ўрока (якога ўзроўню "навучанасці" дасягнулі дзеці на канкрэтным уроку: распазнавання, запамінання, разумення з'явы; узровень уменняў і навыкаў слухання, чытання, пісьма, гаварэння);

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

– аптымальнасць метадаў навучання, якія выкарыстоўваліся на ўроку, іх адпаведнасць логіцы ўрокаў, развіццю школьнікаў;

– эфектыўнасць кантролю ведаў вучняў, аб′ём дамашняга задання і методыка давядзення яго да дзяцей.

**III. Выхаваўчая дзейнасць:**

– у якой ступені вырашаліся задачы маральнага выхавання школьнікаў;

– эфектыўнасць фарміравання працоўных навыкаў школьнікаў на працягу ўрока;

– наколькі правільна і эфектыўна настаўнік выкарыстоўваў сувязь з жыццём пры выкананні выхаваўчых задач.

**Дзейнасць вучняў на ўроку:**

– ступень актыўнасці і ўзровень працаздольнасці;
– наяўнасць цікавасці да ўрока;
– узровень навыкаў самастойнай працы;
– узровень развіцця маўлення;
– тэмы вучэбнай дзейнасці;
– узровень арганізаванасці;
– стыль зносін з настаўнікам і з аднакласнікамі.

У выніку аналізу дзейнасці настаўніка і школьнікаў студэнтамі могуць адлюстроўвацца наступныя моманты:

1. Асноўныя кампаненты ўрока як цэласнай сістэмы: змест вучэбнага матэрыялу, спосабы арганізацыі ўрока.
2. Змяненні ў працэсе ўрока змястоўнага, аперацыйнага і матывацыйнага боку пазнавальнай дзейнасці школьнікаў.
3. Нетрадыцыйныя формы работы на ўроку і іх характарыстыкі.
4. Падрыхтоўка настаўнікаў і школьнікаў да ўрока.
5. Вынікі ўрока.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## 1. 2. ПРЫКЛАДНАЯ СХЕМА НАЗІРАННЯ ЎРОКА

**Тэма ўрока**

______________________________________________

______________________________________________

**Мэты:**

Пазнавальная

______________________________________________

______________________________________________

Практычная

______________________________________________

______________________________________________

Развіццёвая

______________________________________________

______________________________________________

Выхаваўчая

______________________________________________

______________________________________________

**Абсталяванне**

______________________________________________

______________________________________________

**Ход урока**

| Этапы ўрока | Расход часу | Што патрэбнаназіраць |
|---|---|---|
| Арганізацыйны момант | | 1. Падрыхтаванасць настаўніка да пачатку ўрока.<br>2. Рабочае месца, нагляднасць, план-канспект і інш.<br>3. Падрыхтаванасць вучняў да пачатку ўрока: сшыткі, падручнікі, ручкі і інш.<br>4. Як ажыццёўлены пераход да наступнага этапа ўрока: плаўна, лагічна ці рэзка, без сувязі? |
| Аналіз памылак, дапушчаных на папярэдніх уроках | | Узяты памылкі тыповыя ці ўсе ? |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | | |
|---|---|---|
| Апытванне | | 1. Від апытвання. Пастаноўка пытанняў.<br>2. Што выяўляецца? Неабходнасць апытвання.<br>3. Тэмп апытвання.<br>4. Як настаўнік абагульняе адказы вучняў і выдзяляе галоўнае?<br>5. Кантакт настаўніка з класам. |
| Псіхалагічная падрыхтоўка да свядомага ўспрымання новых ведаў | | 1. Як арганізоўваецца ўвага вучняў?<br>2. Матывацыя дзейнасці па засваенні ведаў. |
| Арганізацыя працэсу засваення новых ведаў | | 1. Як ажыццёўлены пераход да выкладання новага матэрыялу? Ці названа (і як) тэма? Як праведзена пастаноўка мэтаў і задач урока? Ці праводзілася актуалізацыя апорных ведаў?<br>2. Узровень даступнасці (логіка, пераканаўчасць, вобразнасць). Сувязь з іншымі прадметамі, з жыццём.<br>3. Спосаб паведамлення ведаў, роля школьнікаў у іх атрыманні, характар пытанняў вучняў. Як выкарыстоўваліся адказы вучняў?<br>4. Кантакт з класам, спосабы ўздзеяння на вучняў, ступень зацікаўленасці. Спосабы павышэння цікавасці да новага.<br>5. Метады актывізацыі. Арганізацыя гутаркі.<br>6. Паводзіны настаўніка ў працэсе падачы матэрыялу (манера трымацца, жэсты, знешні выгляд; маўленчыя асаблівасці; тэмп маўлення, здольнасць да інтэрпрэтацыі, чуласць у адносінах да вучняў). |
| Замацаванне ведаў і фарміраванне уменняў | | 1. Спосабы замацавання ведаў.<br>2. Работа па развіцці самастойнасці (на якім матэрыяле, формы і спосабы замацавання). |
| Канец урока | | 1. Ці зроблена настаўнікам абагульненне на ўроку (падвядзенне агульных вынікаў, каментарый адзнак і ацэнка дзейнасці вучняў)? Ці праводзілася рэфлексія (самаацэнка дзейнасці вучняў)?<br>2. Ці праводзіўся інструктаж па выкананні дамашняга задання? |
| Агульныя заўвагі па ўроку і яго ацэнка | | 1. Ці правільна размешчаны этапы ўрока?<br>2. Мэтазгоднасць часу, затрачанага на кожны этап.<br>3. Ступень выканання плана ўрока.<br>4. Ці дасягнуты мэты ўрока? |
| Іншыя заўвагі па ўроку, парады, пажаданні | | |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Дадатак 2

# ДАВЕДАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ НАЗІРАННЯЎ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## 2. 1. ТЫПЫ ЎРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У час азнаямляльна-адаптацыйнай педагагічнай практыкі пажадана наведаць урокі беларускай літаратуры розных тыпаў. Згодна класіфікацыі М. І. Кудрашова (найбольш распаўсюджанай), існуюць наступныя **тыпы ўрокаў літаратуры**:

1) урокі вывучэння мастацкіх твораў:
   а) урокі мастацкага ўспрымання твора;
   б) урокі паглыбленай работы над тэкстам;
   в) урокі абагульнення работы над творам;
2) урокі вывучэння тэорыі і гісторыі літаратуры;
3) урокі развіцця маўлення.

Тып урока вызначае спалучэнне наступных **структурных элементаў ўрока**:

*Арганізацыйны момант* (прывітанне, праверка падрыхтаванасці вучняў да ўрока, выяўленне адсутных), *паведамленне тэмы ўрока* (тэма ўрока вызначаецца праграмай па літаратуры, калі на вывучэнне твора плануецца адна гадзіна, або настаўнікам, калі твор вывучаецца на працягу некалькіх урокаў), *мэты або задач* (задачы з'яўляюцца канкрэтызацыяй мэты).

*Праверка дамашняга задання* (апытванне вучняў можа адбывацца на працягу ўсяго ўрока, але актуалізацыю апорных ведаў і ўменняў па вызначанай тэме пажадана праводзіць на пачатку ўрока).

*Тлумачэнне новага матэрыялу і яго замацаванне* скіраваны на фарміраванне вызначаных ведаў і ўменняў (на ўроку літаратуры фарміруюцца аналітычныя чытацкія ўменні, скіраваныя на аналіз мастацкага твора, і літаратурна-творчыя, скіраваныя на развіццё вуснага і пісьмовага маўлення).

*Абагульненне вывучанага* (настаўнік абагульняе матэрыял урока, ацэньвае работу вучняў).

*Заданне на дом* (заданне на дом з'яўляецца лагічным працягам работы на ўроку).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## 2. 2. ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН НАЗІРАННЯЎ

1. Наколькі падрыхтаваныя вучні да ўрока (дысцыпліна, мабілізацыя ўвагі)?

2. Наколькі эфектыўнай была матывацыя вучэбнай дзейнасці школьнікаў, актуалізацыя іх ведаў і ўменняў?

3. Наколькі эфектыўна адбывалася на ўроку фарміраванне ведаў і ўменняў у працэсе аналізу мастацкага твора?

4. Як вырашаліся на ўроку выхаваўчыя задачы?

5. Ці былі асабіста значнымі для школьнікаў пытанні і заданні?

6. Метады і прыёмы, якія выкарыстоўваліся на ўроку:
   а) рэпрадуктыўныя;
   б) эўрыстычныя;
   в) даследчыя.

7. Якім чынам падводзіліся вынікі ўрока?

8. Наколькі дамашняе заданне адпавядала мэце і зместу ўрока?

9. Якія былі формы ўліку і ацэнкі ведаў і ўменняў? Ці была аб’ектыўнай ацэнка работы вучняў на ўроку?

10. Які быў тэмп урока?

11. Які быў стыль узаемаадносін настаўніка і вучняў:
   а) аўтарытарны;
   б) “педагогіка супрацоўніцтва”?

12. Ці дасягнуты мэты ўрока?

**Вучэбны дапаможнік**
**па методыцы выкладання**
**беларускай літаратуры**

*Ляшук В. Я.* Методыка выкладання беларускай літаратуры. – Мн., 2004.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# ЗМЕСТ

ПРАГРАМА АЗНАЯМЛЯЛЬНА-АДАПТАЦЫЙНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Дадатак 1. Даведачныя матэрыялы для арганізацыі назіранняў па методыцы выкладання беларускай мовы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
1. 1. Дзейнасць настаўніка і вучняў на ўроку. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
1. 2. Прыкладная схема назірання ўрока . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

Дадатак 2. Даведачныя матэрыялы для арганізацыі назіранняў па методыцы выкладання беларускай літаратуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
2. 1. Тыпы ўрокаў беларускай мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
2. 2. Прыкладны план назіранняў. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Вучэбнае выданне

# ПРАГРАМА АЗНАЯМЛЯЛЬНА-АДАПТАЦЫЙНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ IV КУРСА ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Спецыяльнасці 1 – 21 05 01 “Беларуская філалогія”,
1 – 21 05 04 “Славянская філалогія”

А ў т а р ы – с к л а д а л ь н і к і:
**Мурына** Ларыса Аляксандраўна
**Літвінка** Франя Міхайлаўна
**Рашэтнікава** Ніна Барысаўна
**Саматыя** Ірына Мікалаеўна
**Саўко** Іна Эдуардаўна

У аўтарскай рэдакцыі

Адказныя за выпуск
*І. Э. Саўко, І. У. Таяноўская*

Падпісана ў друк 2005. Фармат 60×84/16. Бумага афсетная.
Гарнітура Таймс. Ум. друк. арк. . Ум.-выд. арк. . Тыраж 50 экз. Зак. .

Беларускі дзяржаўны універсітэт.
Ліцэнзія на ажыццяўленне выдавецкай дзейнасці
№ 02330/0056804 ад 02.03.2004.
220050, Мінск, праспект Незалежнасці, 4.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
на капіравальна-размнажальнай тэхніцы
філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага універсітэта.
220050, Мінск, вул. К. Маркса, 31.